# Пажылыя валанцёры віншуюць юбіляра

29 студзеня 2019г. было арганізавана адраснае віншаванне для юбіляра Пуцята Яўгеніі Антонаўны, якая пражывае ў вёсцы Гродзі.

Валанцёры аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" сумесна са старшынёй сельскага савета і работнікамі АК і Д в. Гродзі павіншавалі юбіляра і падарылі ёй цёплыя словы, добрыя ўсмешкі і музычныя падарункі.

Для валанцёраў і работнікаў аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" стала добрай традыцыяй віншаванне пажылых юбіляраў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці.



